# Гісторыя ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "САЎГАС ВЕЛіКАСЕЛЬСКі"



Першыя калектыўныя гаспадаркі ў Вялікім Сяле і навакольных вёсках з'явіліся ў верасні 1949 года: калгас імя Шверніка ў в.Свянціца, калгас імя Будзёнага ў в.Задворанцы, калгас імя Ламаносава ў в.Хілімонаўцы, калгас "Новый свет" у в.Навасёлкі, калгас "70-годдзе Сталіна" у в.Вялікае Сяло. Першыя гады існавання гаспадарак былі цяжкімі: краіна падымалася з руін пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1950 годзе з'явіўся першы трактар, пазней гаспадаркі атрымалі іншую тэхніку. Не хапала мужчынскіх рук, таму ўпраўляць трактарамі прыходзілася жанчынам.

У 1952 годзе калгасы ўсіх вёсак былі аб'яднаны ў адну вялікую калектыўную гаспадарку – калгас імя 70-годдзя І.В.Сталіна з цэнтрам у вёсцы Вялікае Сяло.

У 1955 годзе калгас імя 70-годдзя І.В.Сталіна (старшыня калгаса – Мікалай Рыгоравіч Жолудаў, сакратар партарганізацыі М.М.Окунева) стаў пераможцам перадмайскага сацыялістычнага спаборніцтва і занесены на раённую Дошку гонару за своечасовую і якасную падрыхтоўку да вясенніх палявых работ. У гэтым жа годзе калгас стаў пераможцам перадкастрычніцкага сацыялістычнага спаборніцтва за атрыманне высокіх ураджаяў усіх сельскагаспадарчых культур.

У сакавіку 1960 года гаспадарка ўвайшла ў склад саўгаса "Вердамічы", а ў 1964 годзе саўгас "Велікасельскі" аформіўся як самастойная гаспадарка з цэнтрам у вёсцы Вялікае Сяло, да якога былі далучаны яшчэ вёскі Манчыцы і Палонка. Саўгас атрымаў у карыстанне зямельную плошчу ў 4899 га, з іх ворных зямель – 3553 га, сенакосаў – 151 га, пашы – 242 га, лясоў і кустарнікаў – 26 га, прысядзібных участкаў – 146 га, садоў – 6 га, іншых зямель – 540 га.

Першым дырэктарам гаспадаркі быў Барыс Лявонцьевіч Квач. На момант утварэння саўгаса тут працавала каля 600 чалавек. Гаспадарка хутка развівалася, на сходах рабочых і служачых прымаліся сацыялістычныя абавязацельствы, якія паспяхова выконваліся. На аснове паглыблення спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці, інтэнсіфікацыі ўсіх галін рабочыя прадпрыемства дабіваліся павелічэння вытворчасці і продажу дзяржаве прадуктаў жывёлагадоўлі, правядзення палявых работ у сціслыя тэрміны на высокім агратэхнічным узроўні.

1 мая 1955 года саўгасу ўручаны пераходны Чырвоны сцяг райкама партыі і райвыканкама па выніках перадмайскага сацыялістычнага спаборніцтва.

У маі 1964 года саўгас "Велікасельскі" прызнаны пераможцам спаборніцтваў па вытворчасці і нарыхтоўцы арганічных угнаенняў (на гектар яравога кліну нарыхтавана па 18,4 тоны мясцовых угнаенняў). Калектыву ўручаны пераходны Чырвоны сцяг.

За добрае ўтрыманне тэхнікі і поспехі ў час вясенне-пасяўной кампаніі трактарнай брыгадзе саўгаса "Велікасельскі" у чэрвені 1965 года ўручаны пераходны Чырвоны сцяг райкама партыі і райвыканкама.



*Група перадавікоў-механізатараў з пераходным Чырвоным сцягам. 1965 год*

У 1965 годзе ў карыстанні саўгаса было каля 3900 га ворных зямель, 158 га сенакосных угоддзяў. Налічвалася 34 трактары, 13 збожжавых, сіласаўборачных, цукроваўборачных камбайнаў, шмат прычапных і навясных прылад. Вядучай галіной з’яўлялася жывёлагадоўля. Вялікая ўдзельная вага ў паляводстве займала вырошчванне збожжавых культур і бульбы. Акрамя таго, на саўгасных палях раслі цукровыя буракі, кукуруза, лён і іншыя культуры. Галоўная задача працаўнікоў саўгаса – няўхільнае павышэнне прадукцыйнасці працы, павелічэнне вытворчасці прадукцыі, зніжэнне яе сабекошту.



*Зялёнае жніво. 1965 год*



*Догляд за пасевамі цукровых буракоў. 1965 год*



*Уборка збожжавых. 1965 год*



*Укладванне сіласнай ямы. 1965 год*



*Вясенняя пасяўная. 1966 год*



*Вываз угнаенняў на поле. 1966 год*

У 60-я гады ў жывёлагадоўлі саўгаса працавала нямала выдатных людзей, самаадданых працаўнікоў. Па выніках раённага конкурсу жывёлаводаў за 1969 год сярод пераможцаў па адкорму свіней – свінарка саўгаса Ніна Паўлаўна Купач.



*Ніна Паўлаўна Купач*

У канцы 60-х гадоў на малочна-таварных фермах гаспадаркі сталі прымяняць машыннае даенне кароў, што дазволіла скараціць працоўны дзень, павысіць прадукцыйнасць працы. Механізацыя дазволіла атрымоўваць малако высокай якасці. У раёне з 1969 года сталі праводзіць конкурс даярак па машыннаму даенню кароў, які ўключаў тры этапы: першы – дойка, другі – разборка, прамыўка, зборка, дэзінфекцыя даільнага апарата і ўстаноўка на часовае захаванне, трэці – тэарэтычны. У 1970 годзе першае месца заняла даярка саўгаса "Велікасельскі" Валянціна Габрыянік.



*Валянціна Габрыянік (пасярэдзіне)*

Ажыццяўляючы ў жыццё рашэнні XXXII з'езда партыі, працаўнікі саўгаса "Велікасельскі" у 1970 годзе дабіліся пэўных поспехаў у развіцці сельскай гаспадаркі. Вырашчаны самы высокі ўраджай збожжавых культур. Кожны гектар даў па 19,9 цэнтнера. Гаспадарка больш чым удвая перавыканала план продажу хлеба дзяржаве. Датэрмінова выкананы заданні пяцігодкі па вытворчасці і рэалізацыі бульбы, мяса, малака, воўны і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.



*Агрэгат "ЗСК-100"ажыццяўляе пагрузку зярна дзяржаве. 1970 год*



*Закладванне сенажа. 1970 год*



*Механізаванае падбіранне траў. 1970 год*

Механізатары – ударная сіла саўгаса. Менавіта на іх плечы ўскладаюцца цяжкія і складаныя справы. Яны неаднаразова ўдзельнічалі ў раённых спаборніцтвах механізатараў. Удзел у конкурсе прымалі толькі тэхнічна адукаваныя і самыя вопытныя трактарысты. У 1970 годзе ў раённых спаборніцтвах трактарыстаў-машыністаў, якія працуюць на гусенічных трактарах маркі “Т-74”, трэцяе месца заняў Міхаіл Курбат.



*Трактарыст Міхаіл Курбат, прызёр раённага спаборніцтва трактарыстаў-машыністаў (4-ы злева). 1970 год*

У сакавіку 1970 года на базе саўгаса ў Вялікім Сяле прайшоў першы этап раённага конкурсу механізатараў па правядзенні сельскагаспадарчых работ, які ўключаў тэарэтычную і практычную часткі. Пераможцам стаў малады, але вопытны механізатар саўгаса Пётр Чурык. У другім этапе раённага конкурсу, які адбыўся ў чэрвені, трактарыст Міхаіл Курбат заняў першае месца і яму ўручаны пераходны кубак райкама прафсаюза і ўпраўлення сельскай гаспадаркі.



*Экзамен па тэорыі пад час раённага конкурсу ў Вялікім Сяле. 1970 год*



*Экзамен па практыцы пад час раённага конкурсу ў Вялікім Сяле. 1970 год*



*Міхаіл Іванавіч Чурык (2-і справа)*



*Пётр Чурык*

З 1973 года саўгас узначальваў Іван Казіміравіч Гойлік. З 1978 па 1983 год дырэктарам быў Анатолій Фаміч Кузьма.



*Анатолій Фаміч Кузьма*



*Уборка бульбы. 1975 год*



*Разгрузка гною на бульбяным полі. 1975 год*



*Адкормачная пляцоўка маладняку малочна-таварнай фермы. 1976 год*



*Узворванне пад азімыя. 1978 год*



*Капаклад-падборшчык за працай. 1979 год*



*На хлебным полі. 1980 год*



*Уборка саломы. 1981 год*



*На зернетоку. 1981 год*

Добрай традыцыяй у саўгасе былі ўрачыстыя провады ўборачных экіпажаў камбайнераў на жатву. На хлебным полі выстрайваўся ўвесь уборачна-транспартны атрад, механізатары стаялі ля сваіх камбайнаў. З наказам аб правядзенні на высокім агратэхнічным узроўні і без страт жатвы звяртаўся дырэктар саўгаса. З прывітальным словам выступалі дзеці з мясцовай школы з пажаданнямі вялікіх намалотаў.



*Урачыстыя провады камбайнераў на жатву. 1980 год*

Дзесятая пяцігодка для свінарак саўгаса была плённай, асабліва 1980 год. У асобныя месяцы штосутачнае прыбаўленне ў вазе свіней склала больш чым 500 гр. І ў цэлым дзесятую пяцігодку выканалі датэрмінова, рэалізаваўшы дзяржаве за чатыры з паловай гады 2270 тон свініны. У студзені 1981 года за высокія поспехі ў вытворчасці і продажы мяса дзяржаве на сходзе перадавікоў народнай гаспадаркі раёна былі ўручаны пераходны Чырвоны сцяг і Ганаровая грамата райкама партыі, выканкама раённага Савета народных дэпутатаў, райкама прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі і райкама камсамола. Поспех гэты каваўся ўдарнай працай усяго калектыву, але асабліва вызначыліся свінаркі А.Буткевіч, М.Радзівонік, Я.Баўфалік, З.Шавель.



*Пераходны Чырвоны сцяг прымаюць дырэктар саўгаса А.Кузьма, сакратар парткама І.Ботвіч, старшыня прафсаюзнага камітэта М.Рудая і сакратар камітэта камсамола Ю.Лінга. 1981 год.*

У саўгасе дзейнічала першасная камсамольская арганізацыя, у якую ўваходзілі юнакі і дзяўчаты, якія працавалі трактарыстамі, паляводамі, жывёлаводамі і інш. У 1981 годзе ў арганізацыі налічвалася 49 чалавек. Лепшымі маладымі работнікамі вытворчасці і самымі актыўнымі па праве лічыліся такія камсамольцы, як механізатар Мікалай Забейда, тэхнік-асемянатар Тамара Лазарчык. Вялікай павагай карыстаўся малады камуніст, член РК КПБ, кандыдат у члены абкама партыі механізатар Сяргей Самсонік.



*Актыўныя камсамольцы першаснай арганізацыі (злева направа) М.Забейда, Т.Лазарчык, С.Самсонік, М.Варонка. 1981 год*

У 1982 годзе камсамолію Свіслаччыны на XXVII з’ездзе камсамола Беларусі прадстаўляла даярка саўгаса “Велікасельскі” Вера Буцько.

Велікасельцы актыўна прымаюць удзел у раённых вучэннях-спаборніцтвах па грамадзянскай ахове. У 1980 і 1981 гадах санітарная дружына саўгаса выступіла на высокім узроўні і стала пераможцам. Узнагароджана Ганаровай граматай райкама партыі і пераходным кубкам.



*Санітарная дружына саўгаса, каманда-пераможца з пераходным кубкам. 1981 год*

У 2012 годзе сандружына заняла другое месца, у 2014 – першае.



*Санітарная дружына саўгаса, каманда-пераможца. 2014 год*

З 1983 па 1996 год узначальваў саўгас Алег Уладзіміравіч Вязіцкі.



*Уборка бульбы. 1983 год*



*Льнокамбайн. 1985 год*



*Сяўба ярыны. 1986 год*



*Пераможцы жатвы–87.*

Да канца 80-ых у гаспадарцы была пабудавана новая рамонтная майстэрня, будынак праўлення. Будаўніцтва жылля вялося хуткімі тэмпамі, узводзіліся шматкватэрныя дамы, катэджы і асабнякі з усімі выгодамі, ацяпляліся ад цэнтральнай саўгаснай кацельні. Кватэры атрымлівалі маладыя сем'і спецыялістаў і рабочых.

Працаўнікі сельскай гаспадаркі не толькі аддана працавалі, але і любілі адпачываць. У 70-я – 80-я гады дзейнічаў самадзейны хор саўгаса, які неаднаразова займаў прызавыя месцы на раённых аглядах-конкурсах. Кіравала самабытным калектывам Таццяна Іванаўна Гуляй.



*Самадзейны хор саўгаса. 1987 год*

Пачатак дзевяностых гадоў – час глабальных зменаў і перабудоў – не мог не аказаць уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі. Саўгас "Велікасельскі", перажываючы спад, па ўсіх вытворчых паказчыках займаў 10-11 радкі. У 1996 годзе кіраўніком саўгаса стаў Юрый Мікалаевіч Турак. У першую чаргу пад яго кіраўніцтвам прайшло акультурванне зямель. Хуткімі тэмпамі стала развівацца раслінаводства. І за кароткі прамежак часу саўгас па ўраджайнасці некаторых культур выйшаў на лідзіруючыя пазіцыі. Пільную ўвагу ўдзялялі развіццю жывёлагадоўлі і фарміраванню трывалай кармавой базы. У гаспадарцы з'явілася шмат новай тэхнікі, што дазваляла спраўляцца з усімі задачамі сваімі сіламі.



*Юрый Мікалаевіч Турак*



*Дырэктар саўгаса Ю.М.Турак аналізуе вынікі работы за 1997 год пад час справаздачнага сходу. 1998 год*



*У зале пад час справаздачнага сходу. 1998 год*

Кіраўнікамі саўгаса былі Пётр Іванавіч Петушкевіч, Віктар Станіслававіч Жыдзель, Уладзімір Іванавіч Сянкевіч, Дзмітрый Віктаравіч Турак.



*Пётр Іванавіч Петушкевіч*



*Дзмітрый Віктаравіч Турак*

За час свайго існавання саўгас пераўтварыўся з гаспадаркі ручной працы ў высокатаварнае сельскагаспадарчае прадпрыемства. У 2001 годзе саўгас рэарганізаваны ва ўнітарнае сельскагаспадарчае прадпрыемства “Саўгас Велікасельскі”.

У пачатку 2000-ых гадоў пасевы апрацоўвалі фунгіцыдамі супраць хвароб з дапамогай верталёта. Паскораныя тэмпы работы і стопрацэнтная ахова пасеваў ад вытоптвання дазваляла атрымаць больш высокі ўраджай.



*Дырэктар і галоўны аграном сумесна з экіпажам верталёта распрацоўваюць план палётаў. 2004 год*



*Апрацоўка пасеваў. 2004 год*

У 2004 годзе саўгас размяшчаўся на 4115 га, сельскагаспадарчыя ўгоддзі займалі 3719 га, з іх ралля – 3096 га, сенакосы – 154 га і паша – 465 га. Працавала ў гаспадарцы 173 чалавека.

У 2013 годзе ў сельгаспрадпрыемстве працавала 106 чалавек. За гаспадаркай замацавана 3280 га сельгасугоддзяў, з іх 2856 га займае ралля, 106 – сенажаці і 318 – паша. Прадпрыемства спецыялізавалася на малочна-мясной жывёлагадоўлі з развітай вытворчасцю збожжа. У структуры таварнай прадукцыі жывёлагадоўля займала 70,9 %, раслінаводства – 29,1 %. У гаспадарцы налічвалася 1350 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 581 галава – дойны статак. У складзе машынна-трактарнага парку налічвалася 21 трактар, 11 грузавых машын, 8 зернеўборачных і 3 кармаўборачных камбайнаў.

У 2014 годзе пабудавана новае памяшканне для ўтрымання маладняку буйнай рагатай жывёлы на 300 галоў, куплены зернеачышчальна-сушыльны комплекс КЗСВ-30.

1 лістапада 2022 года на пасаду дырэктара УСП “Саўгас Велікасельскі” назначаны Сяргей Міхайлавіч Юсько.



*Сяргей Міхайлавіч Юсько*



*Старшыня Свіслацкага райвыканкама А.Л.Вярсоцкі ўручае пасведчанне дырэктара УСП “Саўгас Велікасельскі” С.М.Юсько*

На сённяшні дзень УСП “Саўгас Велікасельскі” – шматпрофільнае сельгаспрадпрыемства, якое спецыялізуецца на вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі мяса-малочнага напрамку, раслінаводства, прапануе транспартныя і ветэрынарныя паслугі насельніцтву.




Асноўныя віды дзейнасці: вырошчванне збожжавых і зернебабовых культур; вырошчванне алейных культур і іх насення; вырошчванне кармавых культур і іх насення; развядзенне буйнай рагатай жывёлы.

На сельгаспрадпрыемстве працуюць 68 чалавек. Агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 3486 га, з іх ралля – 2791 га, сенакосы і пашы – 695 га.

На балансе гаспадаркі – сельскагаспадарчыя ўгоддзі, жывёлагадоўчыя і малочныя фермы, зернесушыльны комплекс, збожжасховішчы, транспартны парк з трактарнай, грузавой, сельскагаспадарчай тэхнікай, агрэгатамі, якія абслугоўваюцца рамонтнымі майстэрнямі. Асноўная задача – вытворчасць якаснай сельгаспрадукцыі.





Галоўны набытак саўгаса “Велікасельскі” – людзі, якія ва ўсе часы паказвалі прыклады добрасумленнай працы. Іх самаадданая праца на карысць роднай гаспадаркі назаўсёды ўпісана ў яе гісторыю. Многія з іх удастоены высокіх узнагарод.

Лепшыя з лепшых напярэдадні Першамая занесены на раённую ДОШКУ ГОНАРУ:

1955 год – цялятніца А.К.Ражкевіч;

1959 год – даярка А.К.Радзівонік, свінарка А.А.Залуцкая, калгасніца сельгасарцелі Л.С.Кавалеўская;

1969 год – свінарка Яніна Адамаўна Коўган; інжынер Сяргей Пятровіч Смурага;

1974 год – трактарыст Пётр Раманавіч Чурык;

1975 год – шафёр Франц Станіслававіч Сідор;

1978 год – шафёр Франц Станіслававіч Сідор;

1979 год – механізатар Мікалай Афанасьевіч Чурык;

1981 год – даярка Вера Сцяпанаўна Ляпешка;

1983 год – шафёр Міхаіл Пятровіч Балюк;

1985 год – шафёр Сяргей Іванавіч Альшэўскі;

1986 год – трактарыст, член парткама, партгрупорг, член райкама партыі Пётр Раманавіч Чурык;

1987 год – трактарыст Іван Сямёнавіч Яроцкі;

1989 год – даярка, член групы народнага кантролю Вера Міхайлаўна Радзецкая;

2002 год – механізатар Міхаіл Міхайлавіч Шайкоўскі;

2008 год – вадзіцель Мікалай Іванавіч Чурык;

2009 год – трактарыст-машыніст Аляксандр Мікалаевіч Габрыянік;
2020 год – трактарыст-машыніст Мікалай Мікалаевіч Забейда;
2022 год – галоўны заатэхнік Сяргей Міхайлавіч Юсько.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за поспехі, дасягнутыя ў сацыялістычным спаборніцтве, і праяўленую працоўную доблесць у выкананні прынятых абавязацельстваў узнагароджаны:




**ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:**

1971 год – свінарка Ніна Паўлаўна Купач;
1973 год – камбайнер Уладзімір Сцяпанавіч Кавалеўскі;
1986 год – трактарыст Пётр Раманавіч Чурык.



*Ніна Паўлаўна Купач*



*Пётр Раманавіч Чурык*



*Уладзімір Сцяпанавіч Кавалеўскі*



**ОРДЭНАМ ЛЕНІНА :**

1971 год – свінарка Аляксандра Васільеўна Буткевіч;
1973 год – трактарыст Мікалай Пятровіч Залуцкі.



*Аляксандра Васільеўна Буткевіч*



*Мікалай Пятровіч Залуцкі*



**ОРДЭНАМ “ЗНАК ПАШАНЫ”:**

1971 год – трактарыст Пётр Раманавіч Чурык;
1975 год – трактарыст Пётр Раманавіч Чурык;
1977 год – трактарыстка Тэрэза Іванаўна Патэнга;
1984 год – трактарыст Пётр Арцёмавіч Галенка.




*Тэрэза Іванаўна Патэнга*



*Пётр Арцёмавіч Галенка*



*Пётр Раманавіч Чурык*



**ОРДЭНАМ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ:**

1971 год – трактарыст Мікалай Пятровіч Залуцкі.



*Мікалай Пятровіч Залуцкі*




## МЕДАЛЁМ “ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ”:

1966 год – трактарыст Мікалай Афанасьевіч Чурык;
1973 год – механізатар жывёлагадоўчай фермы Міхаіл Ігнацьевіч Пекар;
1976 год – шафёр Франц Станіслававіч Сідор.



*Мікалай Афанасьевіч Чурык*




## МЕДАЛЁМ “ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ”:

1977 год – шафёр Віктар Пятровіч Дырында,
трактарыст Мікалай Васільевіч Купач;
1986 год – даярка Валянціна Сцяпанаўна Гуляй.





*Віктар Пятровіч Дырында*



*Валянціна Сцяпанаўна Гуляй*

За шматгадовую добрасумленную працу ў народнай гаспадарцы ў знак прызнання працоўных заслуг выканкамам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджаны

**МЕДАЛЁМ "ВЕТЭРАН ПРАЦЫ":**



1975 год – рабочая Марыя Максімаўна Дырында,
трактарыст Канстанцін Сцяпанавіч Сачко,
рабочы Пётр Фёдаравіч Тур;

1980 год – рабочая Вольга Іванаўна Шагун,
рабочая Ніна Віктараўна Шыпуль,
намеснік галоўнага бухгалтара Ніна Іосіфаўна Радзівонік;

1981 год – загадчыца фермай Зінаіда Фёдараўна Камяк,
рабочая Валянціна Якаўлеўна Кулік,
рабочая Марыя Уладзіміраўна Бурдзюк,
даглядчык жывёл-пастух Іван Паўлавіч Залуцкі,
загадчыца складам Анастасія Юльянаўна Пачэбут,
рабочая Марыя Сцяпанаўна Балейка,
рабочая Раіса Сцяпанаўна Хмара,
рабочая Зінаіда Ільінічна Камяк,
рабочая Сафія Фёдараўна Яромік,
даглядчык жывёл Васілій Яфімавіч Шульскі,
даярка Вольга Іванаўна Гуляй,
рабочая Сафія Паўлаўна Ліс,
майстар-наладчык Уладзімір Трафімавіч Салавей,
вартаўнік Алена Іванаўна Хмурчык;

1982 год – рабочая Ніна Осіпаўна Пацкевіч,
даярка Вера Дзмітрыеўна Буткевіч,
даглядчык жывёл-пастух Іван Юльянавіч Сідзянеўскі,
даярка Ядзвіга Уладзіславаўна Рудая,
рабочая Зінаіда Іванаўна Бурдзюк,
даглядчык жывёл Сафія Пятроўна Пакутнік;

1983 год – рабочы Міхаіл Ігнацьевіч Самсонік,
рабочая Марыя Паўлаўна Самсонік,
прыбіральшчыца Любоў Васільеўна Карневіч,
каваль Пётр Іванавіч Плюшчэўскі,
рабочая Марыя Афанасьеўна Салавей;

1986 год – механізатар Сцяпан Рыгоравіч Баўфал,
свінарка Яўгенія Данілаўна Баўфалік,
жывёлавод Уладзімір Георгіевіч Гуляй,

даярка Яніна Георгіеўна Дубай,
шафёр Сцяпан Макаравіч Жылеўскі,
механізатар Іван Антонавіч Залуцкі,
механізатар Мікалай Пятровіч Залуцкі,
механізатар Уладзімір Сцяпанавіч Кавалеўскі.

Галоўным багаццем УСП “Саўгас Велікасельскі” з’яўляюцца працаўнікі, тыя, што засталіся адданымі роднай зямлі. Яны разумеюць, што заўтра нараджаецца ў сённяшніх працоўных буднях. І кожны дзень куюць вытворчыя поспехі гаспадаркі, робяць велікасельскі край яшчэ багацейшым і прыгажэйшым.




*Механізатар Яўген Балюк*



*Перадавікі малочна-таварнага комплексу “Хілімонаўцы”*